NEWSLETTER
BELARUS Live
www.Belarus-Live.eu
13.02.2009 — 19.02.2009

Верховный суд посчитал законными военные соглашения Лукашенко с Россией

Большая европейская неделя

Олег Волчек: «Более 50 «афганцев» отказались от медалей Лукашенко»

В армии Ивану Шило угрожают дисбатом

Дела настолько плохи, что отчет правительства отменили

В Минске планируется провести выставку Бориса Заборова




Мінулы тыдзень у Беларусі прайшоў пад знакам актыўных кантактаў з прадстаўнікамі структураў аб'яднанай Эўропы. Пікам гэтага працэсу лічыцца даволі нечаканы прыезд у Менск Хаўера Саляны і ягоная сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам. Падобна, рэжым усё ж выходзіць са шматгадовай самаізаляцыі, і хутчэй за ўсё, з найменшымі згубамі і саступкамі Эўропе. Тым ня менш, для прыкладу, стала вядома, што ў дэлегацыі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы і МЗС Беларусі розныя погляды на тое, які можа быць вяртаньне Беларусі ў ПАРЭ. Уключэньне апазыцыі ў склад дэлегацыі беларускага парлямэнту ў ПАРЭ зьяўляецца, паводле кіраўніка дэлегацыі ПАРЭ Г. Ліндблада, ключавым пытаньнем, што абмяркоўвалася падчас візыту ў Менск. «Мы знойдзем спосаб уключыць апазыцыю», – сказаў ён. Аднак, паводле словаў кіраўніка МЗС Беларусі Сяргея Мартынава, прадстаўляць Беларусь у ПАРЭ могуць толькі дэпутаты Нацыянальнага сходу. Варта зазначыць, што падчас сустрэчы з эўрапейскімі парлямэнтарамі сьпікер Рады Рэспублікі Барыс Батура ня выключыў нейкіх варыянтаў удзелу апазыцыі ў абмеркаваньні пэўных пытаньняў па Беларусі на сэсіях ПАРЭ. Але больш ніхто з афіцыйных асобаў пра гэта не казаў і не рабіў удакладненьняў наконт магчымасьцяў апазыцыі. Толькі сам Лукашэнка сказаў, што па падрыхтаваных апазыцыяй дакумэнтах ён з Эўропай наладжваць адносіны ня будзе. У сёньняшняй Беларусі аднога меркаваньня кіраўніка краіны дастаткова, каб было так, а ня йначай.

Думаецца, прадстаўнікоў розных эўраструктураў, якія прыехалі ў Менск, павінна было моцна ўразіць тое, як Лукашэнка публічна, з паказам па тэлебачаньні, даваў указаньні ў выглядзе фармальных просьбаў кіраўнікам вышэйшых судовых

органаў і пракуратуры пра тое, каб яны вызвалілі групу грамадзянаў, якія зрабілі самасуд і забілі чалавека. Гэта да прыкладу пра незалежнасьць судоў і пракуратуры ў Беларусі. Паводле некаторых дадзеных, ня меншае ўражаньне на многіх зрабілі пасажы ў адрас удзельнікаў першага паседжаньня Кансультацыйна-грамадзкай рады пры Адміністрацыі прэзыдэнта з удзелам некаторых асобаў, блізкіх да апазыцыі. Лукашэнка ў даволі грубай форме ахарактарызаваў імкненьне гэтых удзельнікаў паседжаньня дапамагчы ўладам выйсьці з крызысу, што нарастае. Ён проста адхіліў такую дапамогу.

Нягледзячы на тое што прапрэзыдэнцкія СМІ распаўсюджвалі аптымістычную інфармацыю пра сустрэчы, якія прайшлі ў Мінске, стала вядома, што ня ўсіх гасьцей з Эўропы з радасьцю чакалі беларускія ўлады. Так, чальцы дэлегацыі Эўрапарлямэнту па дачыненьнях зь Беларусьсю зазналі вялікія цяжкасьці пры атрыманьні ўязных візаў.

І сытуацыя, што ўзьнікла, была выкліканая ня толькі сэрыяй заяваў кіраўніка гэтай дэлегацыі Яцэка Пратасевіча пра тое, што ён занепакоены існуючай у Беларусі «практыкай гвалтоўнага прызыву ў войска» пры актыўным удзеле прадстаўнікоў спэцслужбаў. «Падобная практыка выклікае сур’ёзныя сумневы ў тым, што ўсеагульны воінскі абавязак не выкарыстоўваецца як адзін зь відаў палітычных рэпрэсіяў супраць апазыцыйных актывістаў», – гаворыцца ў заяве кіраўніка дэлегацыі па дачыненьнях зь Беларусьсю.

Нагадаем, 22 студзеня кіраўніцтва Аб’яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі (АДС) распаўсюдзіла заяву, у якой зьвярнула ўвагу на тое, што прызыў у войска маладзёвых актывістаў ажыцьцяўляецца, «як правіла, пасьля іх выключэньня з ВНУ і незалежна ад іх прыдатнасьці да службы ў войску паводле мэдычных паказаньняў». Сярод тых, хто ўжо патрапіў пад «палітычны прызыў», кіраўніцтва АДС называе Івана Шілу, Франка Вячорку, Зьмітра Жалезьнічэнку, Алеся Каліту, Зьмітра Салаўя.

«Спэцслужбы таксама ўмешваюцца ў працэс прызыву Фёдара Чаранкова, Паўла Батуева, Паўла Кур’яновіча, Зьмітра Хведарука, Арцёма Забарына, Алеся Круткіна, Уладзімера Сяргеева», – гаворыцца ў заяве.

Да гэтых фактаў грубага парушэньня правоў чалавека дадалася і так званая «ваўкавыская справа». Літаральна напярэдадні прыезду эўрапейскіх дэлегацыяў і Хаўера Саляны ў Менск улады сталі раскручваць справу групы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, якіх абвінавацілі ў тэрарыстычных дзеяньнях у дачыненьні да прадстаўнікоў улады і незаконным захоўваньні зброі. Іх арышт суправаджаўся шумнай прапагандысцкай кампаніяй па тэлебачаньні і спэцапэрацыяй байцоў войскаў спэцыяльнага прызначэньня МУС, якія адмыслова прыехалі ў Ваўкавыск зь Менску.

Паводле афіцыйна агучанай вэрсіі, Мікалай Аўтуховіч, Юры Лявонаў і Ўладзімер Асіпенка падазраюцца ў падпалах дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС і гаража супрацоўніка падатковай інспэкцыі, якія адбыліся ў 2004–2005 гг. У той жа час самі ахвяры падпалаў ніякіх прэтэнзіяў да арыштаваных прадпрымальнікаў ня выказалі, бо віноўнікі злачынстваў асуджаныя і адбываюць пакараньне.

Ёсьць нагоды меркаваць, што гэтая тэма гучала падчас сустрэчы Хаўера Саляны з Аляксандрам Лукашэнкам. Варта адзначыць, што Саляна зьявіўся ў Менску пасьля свайго візыту ў Маскву. У інтэрвію радыёстанцыі «Рэха Масквы» ён




прызнаў, што самай вялікай супярэчнасьцю паміж Масквой і Брюсэлем застаецца тэма наступстваў мінулагодняй вайны паміж Расеяй і Грузіяй. Эўразьвяз працягвае асуджаць рашэньне Расеі прызнаць незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі. Хаўер Саляна адзначыў, што Эўразьвяз па-ранейшаму лічыць іх тэрыторыямі Грузіі. Як вядома, дагэтуль Лукашэнка ўхіляецца ад прызнаньня ўсьлед за Расеяй незалежнасьці гэтых тэрыторыяў. Цалкам верагодна, што, зьяўляючыся дасьведчаным у вядзеньні перамоваў, Хаўер Саляна спрабаваў пераканаць Аляксандра Лукашэнку прытрымлівацца і надалей такой пазыцыі ў дачыненьні да захаваньня тэрытарыяльнай цэласнасьці Грузіі. Ня выключана, што пры размове Саляны з Лукашэнкам на гэтую тэму рабіліся спробы прапанаваць і нейкія прэфэрэнцыі, выгодныя крэдыты і праекты

з боку Эўразьвязу для беларускага рэжыму. Аднак, як мяркуюць некаторыя назіральнікі, Саляна мог так сябе паводзіць у Менску і з мэтай пайграць на нэрвах, паінтрыгаваць супраць Крамля. Не сакрэт, што за градусам узроўню разьвіцьця цяперашніх адносінаў паміж аб'яднанай Эўропай і Беларусьсю вельмі ўважліва сочаць у Маскве. Цікава, што падчас сустрэчы ў Менску дэлегацыі ПАРЭ зь мясцовым дыпляматычным корпусам упершыню прысутнічаў амбасадар Расейскай Фэдэрацыі ў Беларусі. Раней, як правіла, на падобныя мерапрыемствы з удзелам прадстаўнікоў эўраструктураў расейскі амбасадар дасылаў толькі сваіх падначаленых. Пра пільную ўвагу расейскага боку кажуць таксама шматлікія і рэгулярныя заявы амбасадара РФ у Беларусі на тыя ці іншыя тэмы. Апошнім часам гэтыя заявы ўсё часьцей сталі выклікаць даволі нэрвовую рэакцыю МЗС Беларусі. А аднойчы, паводле неафіцыйнай інфармацыі, амбасадара нават выклікалі ў замежнапалітычнае ведамства Беларусі для «тлумачальнай размовы».


photo.bymedia.net

Як вядома, вялікую цікавасьць як на Захадзе, так і на Ўсходзе выклікаюць прыватызацыйныя пляны кіраўніцтва. На думку экспэртаў, Аляксандар Лукашэнка дэ-факта паставіў на гэтым крыж на бліжэйшыя два гады.

Падчас наведваньня ААТ «Бабуліна крынка» гаворка ішла пра магчымую прыватызацыю перапрацоўчых прадпрыемстваў. «Хто ў такі крызыс што прадае? На тле ўсясьветнага фінансава-эканамічнага крызысу сёньня ніхто нічога не прадае», – заявіў Лукашэнка. Ён даў зразумець, што незалежна ад крызысу ён у прынцыпе не гатовы прыватызаваць гэтую галіну, у мадэрнізацыю якой, паводле яго словаў, было ўкладзена больш за 1 млрд даляраў. Можна нагадаць, што менавіта такой «прадказальнасьці» беларускага кіраўніка заўжды баяліся замежныя інвэстары. І яны куды больш могуць паўплываць на далейшую хаду дыялёгу Эўропы зь Беларусьсю, чым эўрачыноўнікі.

АФІЦЫЙНА

## Вярхоўны суд палічыў законнымі вайсковыя дамовы Лукашэнкі з Расеяй

***Вярхоўны суд не задаволіў просьбу арганізацыі «Малады Фронт» наконт перадачы ў Канстытуцыйны суд хадайніцтва пра прызнаньне дамоваў, падпісаных Аляксандрам Лукашэнкам у Маскве, антыканстытуцыйнымі.***

Як нагадвае прэс-служба «Маладога Фронту», у адпаведнасьці зь дзейсным заканадаўствам, напрамую зьвярнуцца ў Канстытуцыйны суд ні грамадзяне, ні арганізацыі ня могуць. Гэта можа зрабіць толькі сам Аляксандар Лукашэнка, Нацыянальны сход, Савет міністраў, Вярхоўны суд або Вышэйшы гаспадарчы суд.

Вярхоўны суд адмовіўся выступіць з такім хадайніцтвам, паведаміўшы «Маладому Фронту», што ён можа выступіць з такім хадайніцтвам, калі прыйдзе да высновы пра супрацьзаконнасьць вышэйпаказаных дамоваў пры разглядзе пэўнай судовай справы.

ПАЛІТЫКА

## Вялікі эўрапейскі тыдзень


photo.bymedia.net

***У Менску ў гэтыя дні аншляг з-за наплыву эўрапейскіх гасьцей, паведамляе «Народная воля».***

У панядзелак у Беларусь прыбыла дэлегацыя Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы. На працягу трох дзён прадстаўнікі ПАРЭ плянуюць

абмеркаваць зь беларускімі ўладамі пэрспэктывы далейшага дыялёгу ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека. Павінны адбыцца сустрэчы як з афіцыйнымі асобамі – старшынямі абедзьвюх палат беларускага парлямэнту, генэральным пракурорам, старшынямі Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў, перамовы ў МЗС і Адміністрацыі прэзыдэнта, так і з прадстаўнікамі апазыцыі.

ГРАМАДЗТВА

## Алег Воўчак: «Больш за 50 «аўганцаў» адмовіліся ад мэдалёў Лукашэнкі»

***У дзень 20-годзьдзя вываду савецкіх войскаў з Аўганістану беларускія воіны-інтэрнацыяналісты ў знак пратэсту адмаўляліся ад юбілейных мэдалёў.***




Больш за 50 чалавек накіравалі ў гэтай сувязі зварот да Аляксандра Лукашэнкі і прэм’ер-міністра Сяргея Сідорскага. Пра гэта сайту ucpb.org паведаміў адзін з кіраўнікоў аб’яднаньня «Абаронцы айчыны», праваабаронца Алег Воўчак.

Зварот да кіраўніцтва краіны з патрабаваньнем вяртаньня сацыяльных гарантый падпісалі былыя ўдзельнікі баявых дзеяньняў у Аўганістане з розных рэгіёнаў Беларусі.

«Некаторыя «аўганцы», якія прысутнічалі на сходах, дзе ўзнагароджвалі мэдалямі, заставаліся сядзець у залі, але не выходзілі іх атрымліваць. З-за такога маўклівага пратэсту яшчэ шматлікія мэдалі застануцца ў ваенкамаў», – лічыць Алег Воўчак.




Тое, як улада адносіцца да «аўганцаў» у Беларусі, паводле яговых словаў, «гэта ганьба для Лукашэнкі, гэта б’е па іміджы ўлады. Такога стаўленьня да «аўганцаў» няма нідзе».

Паводле меркаваньня Алега Воўчака, у сувязі з 20-годзьдзем заканчэньня вайны ў Аўганістане можна было б арганізаваць сустрэчу для воінаў-інтэрнацыяналістаў, напрыклад, у Палацы Рэспублікі. «Улады баяцца, што могуць быць эксцэсы, – лічыць ён. – Палітыка зразумелая: каб усе «аўганцы» разам не сабраліся і каб там не адбылося непажаданай размовы і папрокаў як у адрас кіраўніцтва краіны, так і ў адрас кіраўнікоў аўганскага руху».

АПАЗЫЦЫЯ

## У войску Івану Шылу пагражаюць дысбатам

***На гвалтоўна прызванага ў войска актывіста «Маладога Фронту» Івана Шылу распачаўся ціск з боку кіраўніцтва часткі. Пра гэта «Радыё Свабода» паведаміў бацька моладзевага лідэра Ўладзімер Шыла.***




«Па-першае, яго вінавацяць у тым, што ён вось такі сымулянт, бо шмат хварэе. Па-другое, яму закідаюць у віну, што ён чытае такія «правакацыйныя» выданьні, як газэта «Наша Ніва» і часопіс «Arche». А прыватныя размовы, якія Іван вядзе са сваімі саслужыўцамі, назвалі палітычнай дзейнасьцю і нават ужо пачынаюць пагражаць дысбатам. Маўляў, ён займаецца палітычнай дзейнасьцю, а гэта незаконна, і вось мы нешта будзем рабіць», – кажа ён.

Івана Шылу абсьледавалі ў шпіталі ў Лепелі, паколькі ён скардзіцца на болі ў сьпіне і захворваньні горла, якія таксама былі яшчэ да прызыву ў войска. Таму большую частку службы Іван правёў у санчастцы.

Сёньня ў судзе Салігорску адбудуцца папярэднія слуханьні ў справе абскарджваньня рашэньня

прызыўной камісіі, якая дала дазвол на адпраўку Івана Шылы ў войска без мэдычнага абсьледаваньня. Паводле Ўладзімера Шылы, кіраўніцтва часткі гэтую інфармацыю ад Івана хавае.

ЭКАНОМІКА

## Справы настолькі дрэнныя, што справаздачу ўраду адмянілі

***Аляксандар Лукашэнка вырашыў не праводзіць нараду па выніках працы ўраду Беларусі ў 2008 годзе.***

Беларускі кіраўнік заявіў, што ацэніць працу ўраду ва ўмовах сусьветнага крызысу па выніках I кварталу. «Адзнака будзе дадзеная па выніках першага кварталу. Усе, нібыта, варушацца», – заявіў Лукашэнка.

«Каб даць сёньня адзнаку ўраду, у мяне пакуль няма канчатковай высновы ў гэтым пляне», – сказаў ён, адзначыўшы, што «студзень-люты – нетыповы месяц».



photo.bymedia.net

Урад узмоцнена рыхтаваўся да нарады, заплянаванай арыентыровачна на 10 лютага. Злыя языкі пагаворвалі, што шэраг чыноўнікаў, ажно да прэм'ера, могуць пазбавіцца займаных пасад.

Наўрад ці Лукашэнка папросту вырашыў «не мяняць коней на пераправе», піша АФН. На нарадзе, калі б яна адбылася, Лукашэнку прыйшлося б раздаваць чыноўнікам даручэньні: пераглядаць прагнозныя паказьнікі або не, скарачаць або спыняць вытворчасьць, звальняць людзей або адправіць у адпачынкі з захаваньнем 2/3 заробку і г.д.

Відавочна, ён не захацеў браць на сябе гэтую адказнасьць або, хутчэй за ўсё, яму няма чаго прапанаваць ураду. А таму Сідорскаму і ягонай камандзе была дадзеная магчымасьць самастойна матляцца яшчэ пару месяцаў. У залежнасьці ад таго, у які бок кіўнецца сытуацыя, Лукашэнка і будзе прымаць рашэньні па выніках кварталу.

КУЛЬТУРА

## У Менску плянуецца правесьці выставу Барыса Заборава

***Міністэрства замежных спраў Беларусі сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем плянуюць правесьці ў Менску выставу знакамітага беларускага мастака Барыса Заборава.***

Пра гэта паведаміў кіраўнік беларускага замежнапалітычнага ведамства Сяргей Мартынаў на афіцыйнай цырымоніі перадачы карціны Барыса Заборава «Гумно» Нацыянальнаму мастацкаму музэю. Адзін з самых вядомых у сьвеце мастакоў, наш зямляк Барыс Забораў, які жыве ў Парыжы, асабіста прыехаў у Менск, каб



photo.bymedia.net

удзельнічаць у мерапрыемстве. Гэта яго трэці прыезд у Беларусь за 28 гадоў жыцьця ў Францыі.

Барыса Заборава ведаюць ва ўсім сьвеце, яго работы экспануюцца ў найлепшых музэях сьвету. Цяпер яго новая карціна набыла свой дом у беларускай скарбніцы мастацтваў.

Міністар культуры Беларусі Ўладзімер Мацьвяйчук сказаў, што гэтая падзея мае вялікае значэньне для культурнага жыцьця краіны. У Нацыянальным мастацкім музэі Беларусі захоўваюцца работы Барыса Заборава раньняга пэрыяду яго творчасьці, а гэта – першы твор парыскага пэрыяду.

*БелТА*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

ERB
EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.